**ПАМЯТКА ПА РАБОЦЕ НАД ПАМЫЛКАМІ**

**1. ПРОПУСК, ЗАМЕНА ЛІТАР.**

Напішы слова правільна, падкрэслі літару, пастаў націск. Запішы слова яшчэ раз, падзяляючы яго на склады.

*Рабі так: маліна, ма-лі-на.*

**2. ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ.**

Напішы сказ, пастаў патрэбны знак, падкрэслі яго.

*Рабі так: Прыляцела ластаўка.*

**3. ВЯЛІКАЯ ЛІТАРА Ў ПАЧАТКУ СКАЗА.**

Напішы сказ правільна, падкрэслі вялікую літару.

*Рабі так: Узняўся вецер.*

**4. ВЯЛІКАЯ ЛІТАРА Ў СЛОВАХ.**

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі вялікую літару.

*Рабі так: Васіль, Вольга, Янка. Або: Нёман, Днепр, Свіслач.*

**5. ПЕРАНОС СЛОЎ.**

Напішы слова правільна, падзяляючы яго для пераносу. Запішы яшчэ тры словы, падзяляючы іх для пераносу.

*Рабі так: асі-на, лі-лея, агу-рок.*

**6. СЛОЎНІКАВЫЯ СЛОВЫ.**

Напішы слова правільна, падзялі яго на склады, пастаў націск.

*Рабі так: дрымучы, дры-му́-чы.*

**7. ПРАВАПІС Ў.**

Напішы слова або словазлучэнне правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі галосную перад ў.

*Рабі так: маляваў, чытаў, дрэўца. Або: жыве ў лесе, хацелася ўбачыць.*

**8. ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ О, Э. А.**

Напішы слова правільна. Запішы, ад якога слова яно ўтварылася, пастаў націск. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла.

*Рабі так: дамы́ - дом, гарады́ - горад, бары́-бор. Або: рака́ – рэкі, шапта́ць - шэпчуць, цана́ - цэны.*

Словы выключэнні: тэатр, ордэн, гардэроб, тэлефон, інтэрнэт, дэталь і інш.

**9. ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ Е, Ё. Я.**

Напішы слова правільна, пастаў яго ў множны лік, абазнач націскныя склады. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла.

*Рабі так: сяло́ - сёлы, вярба́ - вербы, зямля́ - землі.*

10. **ПАРНЫЯ ЗВОНКІЯ І ГЛУХІЯ ЗЫЧНЫЯ.**

Напішы слова правільна, падбяры праверачнае. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла.

*Рабі так: грыб - грыбы, плод - плады, нізкі - ніzенькі.*

**11. АБАЗНАЧЭННЕ МЯККАСЦІ ЗЫЧНЫХ НА ПІСЬМЕ МЯККІМ ЗНАКАМ.**

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з ь.

*Рабі так: вугаль, рысь, канькі, бульба.*

**12. ЗЫЧНЫЯ Б, П, М, Ф НА КАНЦЫ СЛОЎ.**

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычныя гукі на канцы слоў.

*Рабі так: глыб, восем, россып.*

**13. ЗЫЧНЫЯ Ж, ДЖ, Ч, Ш, Р І ГАЛОСНЫЯ ПАСЛЯ ІХ.**

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з галоснай.

*Рабі так: вожык, жалеза, жоўты.*

**14. ПРАВАПІС Д - ДЗ.**

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з галоснай.

*Рабі так: дзень, дзеці, адзіны.*

**15. ПРАВАПІС Т - Ц.**

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з галоснай.

*Рабі так: ляцеў, цень, ціха.*

У беларускай мове ёсць і цвёрды гук [ц]: цэгла, цыбуля, цукар.

**16. ПАДОЎЖАНЫЯ ЗЫЧНЫЯ.**

Напішы слова правільна, падкрэслі падоўжаныя зычныя. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла.

*Рабі так: галлё, насенне, збожжа.*

**17. РАЗДЗЯЛЯЛЬНЫ МЯККІ ЗНАК.**

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі **ь** і літару, якая стаіць перад ім.

*Рабі так: мільён, каньён, Аркадзьеўна.*

**18. РАЗДЗЯЛЯЛЬНЫ ЗНАК АПОСТРАФ (').**

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла падкрэслі літары, якія раздзяляюцца апострафам.

*Рабі так: пер'е, вераб'і, сям'я.*

**19. ПРЫНАЗОЎНІК.**

Напішы правільна прыназоўнік і слова, да якога ён адносіцца, паміж прыназоўнікам і словам устаў пытанне або іншае слова.

*Рабі так: у лес, у (які?) лес, у (восеньскі) лес.*

**20. НЕ З ДЗЕЯСЛОВАМІ.**

Напішы правільна дзеяслоў і часціцу не. Запішы яшчэ два дзеясловы з часціцай не.

*Рабі так: не чытала, не гавары, не шуміць.*

**21. АДНАРОДНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА.**

Напішы сказ правільна, падкрэслі патрэбныя знакі прыпынку.

*Рабі так: Людзі, жывёлы, расліны хварэюць ад бруднага паветра.*

**22. ПРАВАПІС КАНЧАТКАЎ НАЗОЎНІКАЎ.**

Напішы слова правільна, з дапамогай табліцы вызнач, чаму трэба пісаць такі канчатак. Запішы яшчэ два словы з гэтым канчаткам.

*Рабі так: аб красуні (красуня 1-е скл., М. с.); аб прыгажуні, аб зямлі.*

**23. ПРАВАПІС КАНЧАТКАЎ ПРЫМЕТНІКАЎ.**

Напішы слова правільна, з дапамогай табліцы вызнач, чаму трэба пісаць такі канчатак. Запішы яшчэ два словы з гэтым канчаткам.

*Рабі так: асенняй (ночы) адз. л., ж. р., Д. с., яй, ой, чай; дарагой (матулі), цёплай (зіме).*

**24. ПРАВАПІС КАНЧАТКАЎ ДЗЕЯСЛОВАЎ.**

Напішы слова правільна, абазнач канчатак, утвары неазначальную форму дзеяслова, вызнач спражэнне. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла.

*Рабі так: вяжуць – вязаць (1 спр.); пішуць, спяваюць.*

**25. 2-я АСОБА ДЗЕЯСЛОВА.**

Напішы слова правільна, абазнач канчатак, вызнач асобу. Запішы яшчэ два дзеясловы 2-й асобы.

*Рабі так: пішаш 2-я ас.; гаворыш, робіш.*